baj.by = baj.media

БАЖ – гэта
пра медыя.
Таму наш сайт
цяпер – baj.media

ЭЛЕКТРОННЫ БЮЛЕТЭНЬ

# СМІ Ў БЕЛАРУСІ

№2 (76)
2024



# СТАНОВІШЧА Ў МЕДЫЯСЕКТАРЫ БЕЛАРУСІ: СТУДЗЕНЬ-КРАСАВІК 2024 2023 ГОДА. АГЛЯД

На працягу студзеня-красавіка 2024 года працягваліся рэпрэсіі ў адносінах да незалежных журналістаў і блогераў. Назіралася актывізацыя ўсіх ранейшых відаў пераследу:

- прыцягнення да крымінальнай адказнасці журналістаў і блогераў (у тым ліку завочна);
- ціску на журналістаў (затрыманні, арышты, штрафы);
- цэнзуры праз адміністратыўныя меры.

Міністэрства замежных спраў Беларусі ініцыявала ўжыванне абмежавальных мераў у адказ у дачыненні сродкаў масавай інфармыцыі Латвіі, Літвы і Эстоніі, бо ў гэтых краінах заблакавалі доступ да пэўных беларускіх дзяржаўных СМІ.

Улады Расіі і Беларусі дамовіліся стварыць медыякампанію Саюзнай дзяржавы для прасоўвання агульнай ідэалагічнай павесткі, згодна з агучанай раней ініцыятывай Аляксандра Лукашэнкі.

# КРЫМІНАЛЬНЫ ПЕРАСЛЕД

На працягу гэтага перыяду 4 журналістам былі вынесены прысуды па крымінальных справах.

30 студзеня барысаўскі фатограф Аляксандр Зянкоў быў пакараны трыма гадамі пазбаўлення волі паводле артыкула 361-1 Крымінальнага кодэкса (удзел у экстрэмісцкім фарміраванні): быццам яго здымкі былі паказаны на адным з інтэрнэт-рэсурсаў, прызнаным экстрэмісцкім фарміраваннем.

18 сакавіка кіраўніку «Маланка Медыя» Паўлу Марынічу, а таксама яшчэ чацьвярым фігурантам справы завочна (у парадку спецыяльнай вытворчасці) прызначылі па 4 гады пазбаўлення волі за супрацьпраўныя дзеянні па зрыву рэспубліканскага рэферэндума 2022 года (артыкул 191 Крымінальнага кодэкса).

21 сакавіка былы журналіст-фрылансер з Гомеля Андрэй Толчын атрымаў прысуд 2 гады і 6 месяцаў калоніі па двух артыкулах, за паклёп у дачыненні да прэзідэнта і за «садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці».

22 сакавіка ў Мінску завяршыўся разгляд справы журналіста-фрылансера Ігара Карнея: ён быў прызнаны вінаватым ва ўдзеле ў экстрэмісцкім фарміраванні (мелася на ўвазе Беларуская асацыяцыя журналістаў) і прыгавораны да трох гадоў зняволення.
*https://baj.media/be/aglyady-manitoringi/represii-suprac-zhurnalistau-i-medyya-u-2024-godze-spis-znyavolenyh/*

У студзені-сакавіку былі ўзбуджаны крымінальныя справы ў адносінах да 7 журналістаў, 5 з іх у адносінах да тых, хто знаходзіцца па-за межамі Беларусі.

Затрыманыя раней магілёўскія журналісты Алесь Сабалеўскі і Яўген Глушкоў сталі фігурантамі крымінальных спраў па артыкуле 361-1 Крымінальнага кодэкса (стварэнне экстрэмісцкага фарміравання альбо ўдзел у ім) у сувязі з іх колішнім супрацоўніцтвам з рэгіянальным медыя 6tv.by, прызнаным экстрэмісцкім фарміраваннем.
*https://prisoners.spring96.org/be/person/ales-sabaleuski*



*https://baj.media/be/suprac-videaaperatara-yaugena-glushkova-raspachali-kryminalnuyu-spravu-za-supracu-z/*

Астатнія крымінальныя справы былі ўзбуджаны ў парадку спецыяльнай вытворчасці (завочна). Так, супрацоўніку “Радыё Свабода” Сяргею Дубаўцу інкрымінавалі парушэнне заканадаўства аб супрацьдзеянні экстрэмізму, недапушчэнні рэабілітацыі нацызму і адмаўленні генацыду беларускага народа (усяго паводле шасці артыкулаў Крымінальнага кодэкса).
*https://nashaniva.com/334641*

Супрацоўнік «Радыё Свабода» Юрый Дракахруст і журналістка Ганна Любакова апынуліся сярод 20 беларускіх экспертаў і палітолагаў, якія былі абвінавачаны Следчым камітэтам у тым, што яны «прымалі актыўны ўдзел у выпрацоўцы і рэалізацыі канцэпцыі дэструктыўнай дзейнасці, накіраванай на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь, а таксама садзейнічалі ўзбуджэнню сацыяльнай варожасці і варажнечы ў грамадстве».
*https://baj.media/be/syarod-20-belaruskih-ekspertau-u-dachynenni-da-yakih-adkrytaya-specvytvorchasc-try/*



Паводле артыкула 361-4 Крымінальнага кодэкса (садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці) былі ўзбуджаны справы ў адносінах да журналіста і праваабаронцы з Гродна Ўладзіміра Хільмановіча і рэдактара незалежнага сайта orsha.eu Ігара Казмерчака (яго дадаткова вінавацяць у абразе прэзідэнта).
*https://baj.media/be/sledchy-kamitjet-raspacha-specvytvorchasc-u-dachynenni-da-zhurnalista-uladzimira-hilmanovicha/*

*https://baj.media/be/zhurnalista-igara-kazmerchaka-buduc-sudzic-zavochna/*

# ІНШЫЯ ФОРМЫ ЦІСКУ НА ЖУРНАЛІСТАЎ І МЕДЫЯ

За першыя тры месяцы 2024 года былі зафіксаваны 5 затрыманняў журналістаў, 4 разы медыясупрацоўнікам прысуджалі адміністрацыйныя арышты. Атрымала працяг практыка завочнага асуджэння за адміністрацыйныя правапарушэнні журналістаў-эмігрантаў: звязанай з тэлеканалам "Белсат" Алене Шабуні прысудзілі ў Віцебску штраф у памеры 2800 рублёў. З пратаколаў, дасланых па пошце, стала вядома, што падставай для адміністрацыйнага пераследу стаў "распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў" (артыкул 19.11 КаАП).
*https://baj.media/be/shtraf-zhurnalistcy-alene-shabuni/*

У рамках палітычных чыстак 19 лютага былі затрыманы за падтрымку поствыбарных пратэстаў і, верагодна, звольнены вядучая «Альфа Радыё» (уваходзіць у дзяржаўны холдынг «СБ. Беларусь сегодня») Наталля Жукоўская і яго гукарэжысёр Дзмітрый Кулікоўскі.
[https://baj.media/be/gubazik-zatrymau-vyaduchuyu-i-gukarezhysyora-alfa-radyyo/](https://baj.media/be/gubazik-zatrymau-vyaduchuyu-i-gukarezhysyora-alfa-radyyo/)

# ВЫКАРЫСТАННЯ “АНТЫЭКСТРЭМІСЦКАГА ЗАКАНАДАЎСТАВА” ДЗЕЛЯ АБМЕЖАВАННЯ СВАБОДЫ ВЫКАЗВАННЯ

Доступ да інфармацыі з незалежных крыніц, як і раней, улады абмяжоўвалі, выкарыстоўваючы заканадаўства для барацьбы з экстрэмізмам. Былі прызнаны экстрэмісцкімі фарміраваннямі 7 медыяпраектаў: «Беларускае Радыё Рацыя», якое месціцца ў Беластоку (Польшча), «DW Беларусь (Немецкая волна Беларусь)», «UDF — новости Беларуси», «Это Минск, детка» (уключаючы акаўнты ў сацыяльных сетках блогера Усяслава Пашкевіча, вядомага як «Тутэйшы Шляхціч»), інфармацыйны сайт непрызнанага беларускімі ўладамі грамадскага аб’яднання «Саюз палякаў на Беларусі» ZnadNiemna.pl, а таксама праект «Чаго

брэшаш?», які займаецца разборам прыёмаў дзяржпрапаганды.
https://mvd.gov.by/ru/news/8642

4 красавіка з’явіўся загад Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, які прадугледжвае ануляванне даменных імёнаў інтэрнэт-рэсурсаў, уключаных у Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Выконваць гэта належыць адміністратару нацыянальнай даменнай зоны.
https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=T62405642

Першымі незалежнымі медыя, якія трапілі пад гэтыя новыя правілы, сталі інфармацыйныя сайты reform.by і Media-Polesye.by.
https://baj.media/be/damennae-imja-reform-by/

https://baj.media/be/damennae-imja-media-polesye/

Рэгіянальныя сайты «Першы Пінскі» і stolin.by, новы сайт “Брэсцкай газеты”, інфармацыйны сайт Reformation — Reform.by, кантэнт сацсетак аналітыка Сяргея Чалага і журналісткі Кацярыны Пытлевай, TikTok-акаўнт «Misha Gypsynkov» блогера-гумарыста Міхаіла Цыганкова, а таксама іншыя медыярэсурсы былі аднесены да “экстрэмісцкіх матэрыялаў”.

13 лютага кантэнт тэлеграм-канала «БАЖ Беларуская асацыяцыя журналістаў» (t.me/bajmedia), а 18 сакавіка і старонка baj.media ў сацыяльнай сетцы TikTok былі прызнаны «экстрэмісцкімі».
https://nashkraj.by/news/obshchestvo/chetyre-telegram-kanala-priznany-ekstremistskimi-po-zayavleniyu-baranovichskogo-mezhrayonnogo-prokur/

3 замежных медыя ў Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў былі ўключаны медыяпраект «Настоящее время» (шэсць яго тэматычных рэдакцый), а таксама два артыкулы пад загалоўкамі «Наш Пушкин» і «Братский народ” как пушечное мясо», размешчаныя на сайце нямецкай газеты “Die Tageszeitung”.
http://mininform.gov.by/documents/respublikanskiy-spisok-ekstremistskikh-materialov/



# БЛАКІРОЎКА АНЛАЙН-РЭСУРСАЎ

З прычыны цэнзуры Міністэрства інфармацыі прымала рашэнні аб блакіроўцы доступу да анлайн-рэсурсаў. Так, сайт расследвальніцкага інфармацыйнага медыяпраекта «Бюро медыя» (buromedia.io.) быў заблакаваны прыкладна праз 30 хвілін пасля размяшчэння публікацыі пра Беларускі Чырвоны Крыж.
https://baj.media/be/paslya-publikacyi-pra-zamezhnyya-vayazhy-belaruskaga-chyrvonaga-kryzha-zablakavali/

Доступ карыстальнікаў да рэгіянальнага інфармацыйнага інтэрнэт-выдання «Мой Брест» (www.mybrest.by) быў абмежаваны з-за "выкрытага" Мініфармам парушэння заканадаўства аб сродках масавай інфармацыі – наяўнасці гіперспасылкі на "экстрэмісцкі" belsat.eu у публікацыі 2017 года.
https://baj.media/be/na-zagad-ministra-infarmacyi-u-belarusi-zablakavali-sayt-moy-brest/

Ахвярай палітычнай цэнзуры стаў "Беларускі N-корпус" (калекцыя тэкстаў сучаснай беларускай мовы). Калі пасля паўгоду бяздзеяння ён аднавіў працу, з яго зніклі амаль 90% тэкстаў, у тым ліку публікацыі нелазежных беларускіх СМІ. Адроджаны корпус вэб-рэсурсаў цяпер уключае толькі сайты дзяржаўных «БелТА», газеты «Звязда», Белтэлерадыёкампаніі і афіцыйны сайт Аляксандра Лукашэнкі.
https://nashaniva.com/334616

Нават рэкламныя публікацыі падвяргаліся цэнзуры. Так, сетка магазінаў «Міла» пасля абразаў і абвінавачванняў у праўладных Тэлеграм-каналах была вымушана выдаліць пост у Instagram, у якім фігураваў вядомы вядучы Яўген Перлін, што звольніўся з дзяржаўнага тэлебачання пасля выбараў 2020 года.
*https://news.zerkalo.io/cellar/61075.html?tg=7*

*https://baj.media/be/mininfarm-abmezhava-dostup-da-medyja/*

# ПАДЗЕІ Ў ДЗЯРЖАЎНЫМ МЕДЫЯСЕКТАРЫ

Ідэалагізацыя дзейнасці дзяржаўных СМІ атрымала працяг у рамках Саюзнай дзяржавы – мяркуецца стварэнне і прасоўванне агульных медыйных наратываў. 29 студзеня на пасяджэнні Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі ў Санкт-Пецярбургу была падпісана пастанова аб стварэнні медыякампаніі Саюзнай дзяржавы, ідэя якога агучвалася Аляксандрам Лукашэнкам на працягу некалькіх гадоў. Па словах міністра лічбавага развіцця, сувязі і масавых камунікацый Расійскай Федэрацыі Максута Шадаева, на дадзены момант у медыяхолдынг будуць уваходзіць ужо існуючыя дзве штотыднёвыя газеты «Союзное Вече» і «Союз. Беларусь — Россия», часопіс «Союзное государство» і тэлерадыёвяшчальная арганізацыя Саюзнай дзяржавы, якія будуць забяспечваць «адзіную скаардынаваную палітыку».
*https://tass.ru/obschestvo/19847771*

*https://baj.media/be/pucin-i-lukashenka-padpisali-dagavor-ab-stvarenni-abyadnanaga-medyyaholdynga-rasii-i/*



Фото: ИЗВЕСТИЯ/Дмитрий Коротаев

На запуск медыяхолдынга накіруюць 1 мільярд расійскіх рублёў (каля 11 мільёнаў долараў) з бюджэту Саюзнай дзяржавы. Яго асноўны офіс будзе знаходзіцца ў Маскве, а прадстаўніцтва — у Мінску. У холдынг плануецца ўключыць "рэсурсны цэнтр", які будзе фармаваць кантэнт для распаўсюду праз электронныя сродкі інфармацыі. https://iz.ru/1661728/elizaveta-krylova/obediniai-i-deistvui-na-sozdanie-soiuznogo-mediakholdinga-napraviat-1-mlrd-rublei

У самой Беларусі працягвалася стварэнне медыяхолдынгаў (аб'яднаных рэдакцый) з мясцовых дзяржаўных газет. Падчас пасяджэння Брэсцкага аблвыканкама 25 студзеня паведамлялася пра стварэнне ў вобласці трох такіх рэдакцый. Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Брэсцкага аблвыканкама Таццяна Гагакава заявіла, што «праца ў інтэрнэт-пасторы — задача №1 для сучаснага СМІ", таму ў дзвюх рэдакцыях прыцягнулі да працы ў рэдакцыях блогераў. Па словах міністра інфармацыі Уладзіміра Пярцова, які прысутнічаў у Брэсце, у Беларусі выбудавана «дзейсная сістэма падачы інфармацыі, але недзе яе трэба завастрыць і перафарматаваць: у Брэсцкай вобласці гэта ўдалося выканаць на 97%». https://baj.media/be/u-bresce-chynouniki-azadachylisya-chamu-lyudzi-mensh-chytayuc-dzyarzhaunyya-gazety-vyysce/

Прапагандысцкая дзейнасць дзяржаўных СМІ прывяла да дадатковых абмежавальных мераў.

У красавіку стала вядома, што прыпыненне членства Белтэлерадыёкампаніі ў Еўрапейскім вяшчальным саюзе (EBU), якое першапачаткова было ўстаноўлена да ліпеня 2024 года, стане бестэрміновым у выпадку адсутнасці паляпшэння сітуацыі. Яно дзейнічала з мая 2021 года і было матывавана адсутнасцю аб’ектыўнасці, свабоды прэсы і незалежнасці, рэпрэсіямі ў дачыненні да журналістаў і паказам у эфіры так званых «пакаяных» відэа, прыраўнаваных да катаванняў.
[https://reform.news/priostanovka-chlenstva-belteleradiokompanii-v-ebu-stanet-bessrochnoj](https://reform.news/priostanovka-chlenstva-belteleradiokompanii-v-ebu-stanet-bessrochnoj)

У сакавіку Нацыянальны савет Латвіі па электронных СМІ (NEPLP) вырашыў забараніць доступ да сайтаў тэлеканала АНТ (ont.by) і дзяржаўнага медыяхолдынга «СБ. Беларусь сегодня» (sb.by) як датычных да распаўсюду агрэсіўнай расійскай прапаганды і ненавісніцкіх выказванняў.
[https://rus.delfi.lv/57860/latvia/56402982/neplp-zakryl-dostup-k-devyati-saytam-s-rossiyskoy-propagandoy](https://rus.delfi.lv/57860/latvia/56402982/neplp-zakryl-dostup-k-devyati-saytam-s-rossiyskoy-propagandoy)



Фота Unsplash

Міністэрства інфармацыі Беларусі ў адказ [выступіла](#) з заявай аб «недапушчальных дзеяннях, накіраваных на абмежаванне свабоды слова і мэтанакіраванае пазбаўленне латышскіх грамадзян права на атрыманне поўнай і аб’ектыўнай інфармацыі».
[https://baj.media/be/u-latvii-zabaranili-dostup-da-ant-i-sb/](https://baj.media/be/u-latvii-zabaranili-dostup-da-ant-i-sb/)

8 красавіка, у сувязі з увядзеннем забароны на дзейнасць асобных сродкаў масавай інфармацыі Беларусі на тэрыторыі Латвіі, Літвы і Эстоніі, Міністэрства інфармацыі ў якасці меры ў

адказ пастанавіла абмежаваць на тэрыторыі Беларусі доступ да шэрагу медыя гэтых краін (не прыводзячы пералік замежных выданняў). Зроблена гэта было на падставе апавяшчэння Міністэрства замежных спраў Беларусі.
[https://www.chn.belta.by/society/view/mininfarm-abmezhavau-dostup-da-sheraga-medyja-latvii-litvy-i-estonii-129950-2024/](https://www.chn.belta.by/society/view/mininfarm-abmezhavau-dostup-da-sheraga-medyja-latvii-litvy-i-estonii-129950-2024/)


Фота jcomp

На фоне міжнародных санкцый Міністэрства інфармацыі пачало ўжываць механізм іх абыходу на падставе закона, прынятага ў 2023 годзе, што дазваляе выкарыстоўваць аб’екты інтэлектуальнай уласнасці без згоды праваўладальніка, калі той уключаны ў спіс «недружалюбных» краін. Пастановамі міністэрства ад 14 лютага і 19 красавіка Міжнародная федэрацыя футбольных асацыяцый (ФІФА) і Саюз еўрапейскіх футбольных асацыяцый (УЕФА) былі ўключаны ў гэты самы спіс, што дае магчымасць трансляваць у Беларусі футбольныя чэмпіянаты без атрымання адпаведнага дазволу.
[https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W22441166](https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W22441166)

[https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W22441422](https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W22441422)

«БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ»

baj.media

Змест гэтага электроннага выдання абаронены нормамі Аўтарскага права.
Спасылка на «Беларуская асацыяцыя журналістаў» пры выкарыстанні матэрыялаў ЭЛЕКТРОННАГА БЮЛЕТЭНЯ «СМІ Ў БЕЛАРУСІ» з'яўляецца абавязковай.

Кантакт:
Бастунец Андрэй Леанідавіч

E-mail: office@baj.media
Web: https://baj.media/